УДК 004.738.5:81'42

# ІНТЭРНЭТ-ДЫЯЛОГ ЯК СПЕЦЫФІЧНЫ ВІД КАМУНІКАЦЫІ

***В.А. Палавінскі*** (МДУ імя А.А. Куляшова)
Навук. кір. ***В.М. Шаршнёва***,
канд. філал. навук, дацэнт

Сёння з упэўненасцю можна казаць пра тое, што інтэрнэт – самая вслізарная крыніца інфармацыі, пра якую ведала чалавецтва. Але ж яго магчымасці, такія, як аператыўнасць, хуткасць і даступнасць сувязі паміж карыстальнікамі на розных дыстанцыях, дазваляюць выкарыстоўваць інтэрнэт не толькі як сродак пазнання, але і як сродак камунікацыі.

У віртуальнай прасторы асоба апранае маску, якая спрашчае працэс камунікацыі, пазбаўляе псіхалагічнага бар'еру, вызваляе творчае «я». Унікальную магчымасць для самавыяўлення даюць такія цікавыя формы інтэрнэт-дыялога, як разнастайныя чаты, форумы, электронныя скрыні, блогі і інш. Хуткасць прыёму інфармацыі таксама спрашчае інтэрнэт-дыялог, пазбаўляе адказнасці за доўгатэрміновасць наступстваў [1].

На думку даследчыка В.М. Шаршневай, тэхнічная рэалізацыя інтэрнэт-дыялога зусім не пазбаўляе яго сувязі з ужо вядомымі формамі рэалізацыі як вуснага, так і пісьмовага маўлення. Наадварот, магчымасць уплываць на ўзнікненне і развіцце новай сістэмы мультымедыйных жанраў і віртуальнага жанразнаўства накіроўвае на дасягненне групавых, сацыяльных, эстэтычных і пазнавальных мэтаў, здольных уплываць на фарміраванне стыляў мовы і маўлення [2, с. 129–131].

Такім чынам, інтэрнэт актывізуе ўвагу карыстальніка да пэўных сродкаў камунікацыі. Віртуальныя асобы становяцца стваральнікамі новых вербальных і невербальных сродкаў выказвання, ствараюць не толькі саму віртуальную прастору, але ж і мову, на якой ствараецца інтэрнэт-дыялог.

## Літаратура

1. **Самойленко, Л. В.** Языковые аспекты виртуальной коммуникации / Л. В. Самойленко // Русская словесность в контексте современных интеграционных процессов : материалы Междунар. науч. конф., г Волгоград, 24–27 апр. 2005 г. / под ред. А. В. Шестакова. – Волгоград, 2005. – 818 с.

2. **Шаршнева, В. М.** Інтэрнэт-зносіны як спецыфічны від камунікацыі / В. М. Шаршнева // Куляшоўскія чытанні : матэрыялы Міжнар. навукова-практ. канф., Магілёў, 20–21 красавіка 2017 г. / пад рэд. В. М. Шаршневай. – Магілёў : МДУ імя А.А. Куляшова, 2017. – С. 129–131.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова